ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

10 верасня чацвер

№ 24(1545)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі ўніверсітэт ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### ЛІТАРАТУРНА-МУЗЫЧНЫ ВЕЧАР

«Уладзімір Высоцкі» правялі супрацоўнікі аддзела ідэйна-выхаваўчай і масавай работы бібліятэкі ўніверсітэта на геаграфічнай базе «Заходняя Бярэзіна». Вядучыя расказалі супрацоўнікам БДУ імя У. І. Леніна аб жыцці і творчасці спевака, кампазітара і паэта. Асабліва спадабаліся прысутным запісы з песнямі У. Высоцкага.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### ПРАЦЯГВАЕ РАБОТУ

лагер працы і адпачынку «Феадасійскі». У гэтым месяцы студэнты ўніверсітэта працуюць у чацвёртую змену.

Ч. ВІКТАРАЎ.

### ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

шырока прапагандаваць дасягненні нашых вучоных на выстаўках склалася ў БДУ імя У. І. Леніна. У мінулым годзе ўніверсітэт прыняў удзел у 11 міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх выстаўках. А нядаўна прыйшла радасная навіна: распрацоўкі нашых біёлагаў і географаў па праблемах аховы навакольнага асяроддзя атрымалі пяць медалёў ВДНГ СССР.

Прылады, макеты, кнігі — экспанаты юбілейнай выстаўкі ВДНГ СССР «70 гадоў пад сцягам Вялікага Кастрычніка — шляхам міру і прагрэсу». Вялікую цікавасць наведвальнікаў, спецыялістаў выклікаюць распрацоўкі вучоных на міжгаліновай выстаўцы «Машынабудаванне да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка» і на экспазіцыі ВДНГ БССР, куды ўніверсітэт прадставіў сем навуковых распрацовак.

Ёсць што паказаць нам і на міжнароднай арэне. Ужо ў гэтым годзе падрыхтаваны экспанаты на міжнародны кірмаш у Плоўдзіве (НРБ), а ў кастрычніку нашы індыйскія сябры на выстаўцы «Навука, тэхніка і эканоміка Беларускай ССР» будуць мець магчымасць пазнаёміцца з новымі работамі ўніверсітэцкіх фізікаў.

Рыхтуюцца новыя ўзоры прылад і макетаў, якія ў наступным годзе прымуць удзел у міжнародным кірмашы ў г. Заграбе (СФРЮ), узгоднены таксама перспектыўныя экспазіцыйныя планы з ВДНГ СССР і БССР.

А. ШЭЛЕСТ,
супрацоўнік факультэта журналістыкі.

## ПАСЛЯ ПАДЗЕІ






(Рэпартаж з Дня ведаў чытайце на 2-й стар.).

## ТОЛЬКІ ФАКТ

### Віншуем!

ПАДВЕДЗЕНЫ вынікі Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» у 1986 годзе. Калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і сакратарыят ЦК ВЛКСМ адзначылі яе ўзрослую ролю ў актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і развіцці творчых здольнасцей студэнтаў ВНУ, у павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

У самым масавым унутрывузаўскім туры алімпіяды прынялі ўдзел 32 ВНУ БССР, у ім удзельнічалі 64,3 працэнта студэнтаў. Праведзены 762 алімпіяды і конкурсы па спецыяльнасці. 759 студэнтаў — пераможцаў І-га тура прынялі ўдзел у рэспубліканскіх алімпіядах і конкурсах па спецыяльнасці.

Падводзячы вынікі 3-га тура, журы вызначыла 120 лаўрэатаў Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» у 1986 годзе. Звання лаўрэатаў удастоены студэнты з 14 саюзных рэспублік, гарадоў Масквы і Ленінграда, у тым ліку 6 студэнтаў-замежнікаў. Сярод лаўрэатаў — 18 студэнтаў з Беларусі. Пяцёра з іх занялі першыя месцы.

Сярод пераможцаў — Семерыкоў Ігар Барысавіч, студэнт БДУ імя У. І. Леніна (па спецыяльнасці правазнаўства).

## У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭЦЕ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

# Аб нездавальняючым стане спраў з развіццём матэрыяльна-тэхнічнай базы Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна

У прынятай па гэтаму пытанню пастанове ЦК Кампартыі Беларусі адзначае, што адсутнасць з боку Савета Міністраў БССР і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР яснай перспектывы развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна прывяла да таго, што цяпер шэсць аб'ектаў універсітэта расканцэнтраваны на тэрыторыі трох раёнаў г. Мінска і Мінскага сельскага раёна, рад факультэтаў размяшчаецца ў прыстасаваных будынках. Сур'ёзна адстае матэрыяльная база грамадскага харчавання, фізкультуры і спорту. Некаторыя будынкі даваеннай пабудовы знаходзяцца ў аварыйным стане.

Забяспечанасць вучэбнымі плошчамі складае каля 10 квадратных метраў у разліку на аднаго студэнта пры норме 16,6 квадратнага метра, дэфіцыт вучэбна-лабараторных плошчаў — 67 тысяч квадратных метраў.

Не выкананы пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, якія датычылі развіцця Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Так, у маі 1974 г. з мэтай выканання рашэння ЦК КПБ па запісцы ўніверсітэта Саветам Міністраў БССР была прынята пастанова «Аб мерах па далейшаму развіццю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна», у адпаведнасці з якой прадугледжвалася будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка ў раёне в. Шчомысліцы. Былі распрацаваны тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне і схемы генплана новага гарадка БДУ, пачата праектаванне і будаўніцтва рада аб'ектаў. Да 1980 года тут пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю будынкі і збудаванні коштам каля 16 мільёнаў рублёў.

Аднак асваенне пляцоўкі ажыццяўлялася крайне марудна, пастанова ў аснове сваёй не была выканана.

У снежні 1979 г. у адпаведнасці з прапановай створанай ЦК Кампартыі Беларусі камісіі ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР з мэтай змянення папярэдняга рашэння прынялі пастанову аб размяшчэнні асноўнай вучэбнай і навуковай базы БДУ па Ленінскім праспекце ў паркавай зоне, якая прымыкае да жылога мікрараёна Усход-1.

Нягледзячы на тое, што ў 1980 годзе распрацавана тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне перспектыўнага развіцця комплексу БДУ на гэтай пляцоўцы, Дзяржпланам БССР і Мінскім гарвыканкомам было зроблена заключэнне аб магчымасці пачатку будаўніцтва комплексу толькі ў канцы дванаццатай пяцігодкі. Беспрынцыповую пазіцыю ў гэтым пытанні заняло Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, а Саўмін БССР не змог даць прынцыповай ацэнкі фактам ігнаравання пастаноў ЦК КПБ і ўрада рэспублікі. Будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка па Ленінскім праспекце так і не было пачата.

У красавіку 1985 г. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР у сваёй пастанове палічылі мэтазгодным прадоўжыць будаўніцтва аб'ектаў універсітэта на адведзенай раней пляцоўцы ў раёне в. Шчомысліцы. У гэтай зоне ВНУ выдзелен зямельны ўчастак плошчай 139,3 гектара.

Аднак і тут работы па-сапраўднаму не разгорнуты. Дзяржпланам БССР і Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР так і не вызначаны капітальныя ўкладанні на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта на дванаццатую пяцігодку. Дзяржбуд БССР, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і Мінскі гарвыканком не забяспечылі распрацоўку генеральнага плана забудовы ўніверсітэцкага гарадка і праектна-каштарыснай дакументацыі для будаўніцтва аб'ектаў БДУ.

Такое становішча спраў не стала прадметам асаблівай трывогі і заклапочанасці з боку Савета Міністраў БССР (тт. Еўтуха У. Г., Мазай Н. М.), Дзяржплана БССР (т. Кебіча В. Ф.), Дзяржбуда БССР (т. Пуплікава Ю. А.). Кіраўнікі гэтых органаў занялі чакальную пазіцыю. Па-ранейшаму адсутнічаюць стратэгічная лінія, прынцыповасць, настойлівасць і дзелавітасць у вырашэнні пытанняў развіцця ўніверсітэта ў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і асабіста ў міністра т. Мяшкова М. М.

У поўнай меры вінаваты ва ўзнікшай неспрыяльнай абстаноўцы з развіццём матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта і аддзелы ЦК КПБ — навукі і навучальных устаноў, будаўніцтва і гарадской гаспадаркі, эканамічны.

За непрыняцце мер па выкананню пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 12 красавіка 1985 г. «Пытанні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна» Цэнтральны Камітэт КПБ строга ўказаў членам КПСС тт. Карнієвічу М. Ф., Пуплікаву Ю. А., Мяшкову М. М.

Звернута ўвага тт. Еўтуха У. Г., Кебіча В. Ф., Мазай Н. М., Дземчука М. І. на праяўленую недысцыплінаванасць у арганізацыі выканання пастаноў ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР па пытаннях развіцця Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Савету Міністраў БССР, Дзяржплану БССР, Дзяржбуду БССР, Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Мінскаму гарвыканкому даручана да 1995 года ажыццявіць перавод факультэтаў прыродазнаўчага профілю і навукова-даследчых інстытутаў Белдзяржуніверсітэта на новую пляцоўку ў раёне в. Шчомысліцы і давесці пры гэтым забяспечанасць ВНУ вучэбна-навуковымі плошчамі, а таксама аб'ектамі сацыяльна-культурнага прызначэння да існуючых нарматываў. Для гэтага пачынаючы з 1988 года забяспечваць штогод увод у дзеянне не менш двух-трох вучэбна-лабараторных, вучэбна-навуковых карпусоў, інтэрнатаў, жылых дамоў, буйных аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы БДУ імя У. І. Леніна.

Дадзена даручэнне Савету Міністраў БССР у трэцім квартале 1987 г. вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на безумоўнае выкананне данага рашэння і пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 12 красавіка 1985 г.

У чацвёртым квартале 1988 г. прадставіць у ЦК КПБ макет забудовы ўсяго комплексу Белдзяржуніверсітэта і прапановы па архітэктурнаму рашэнню галоўнага корпуса.

Дзяржплану БССР, Дзяржбуду БССР, Міністэрству будаўніцтва БССР забяспечыць пачатак будаўніцтва галоўнага корпуса ўніверсітэта ў 1990 годзе.

Аддзелам навукі і навучальных устаноў, будаўніцтва і гарадской гаспадаркі ЦК КПБ даручана ўзяць на асобы кантроль вырашэнне пытанняў, звязаных з перспектывамі развіцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна.

# Усеагульны экзамен

## ЗВАРОТ МІНІСТРА ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ СССР Г. А. ЯГАДЗІНА ДА ВЫКЛАДЧЫКАЎ ВНУ

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!

Новы вучэбны год мае для нас вялікае значэнне: усе мы — ад міністра да асістэнта — трымаем экзамен перад партыяй і народам, нашымі вучнямі. Экзамен на прафесіяналізм, любоў і адданасць сваёй справе, добразычлівасць і справядлівасць.

Нам трэба зрабіць рашучыя крокі ў развіцці дэмакратычных традыцый вышэйшай школы, аднавіць культ ведаў, прэстыж сумленнай і якаснай працы, павагу да творчага чалавека, па-бацькоўску беражлівыя і патрабавальныя адносіны да студэнта, пакончыць з фармалізмам, бюракратычнай мітуснёй, пратэкцыянізмам, аўтарытарным стылем у навучанні і выхаванні. Галоўным клопатам становіцца высокая якасць падрыхтоўкі спецыяліста, яго кампетэнтнасць і прафесіяналізм, яго грамадзянскасць. Без гэтага не вывесці краіну на перадавыя рубяжы навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу. Трэба даць студэнту актыўныя веды, уменне выкарыстоўваць іх на практыцы.

Сёння ВНУ дадзены шырокія правы ў вызначэнні метадаў і сродкаў навучання. Гэта дапаможа карэнным чынам перабудаваць вучэбны працэс, навучыць студэнтаў працаваць самастойна, бачыць задачы і ўмець іх рашаць. Неабходна пастаянна думаць, эксперыментаваць, знаходзіць найлепшыя метады навучання, упарта дамагацца пастаўленых мэт. Нават самы малы поспех — гэта крок наперад.

Краіна даверыла нам справу велізарнай важнасці — навучаць і выхоўваць новае пакаленне савецкай інтэлігенцыі. Яе прафесіяналізм, высокія маральныя якасці ў многім вызначаюць сённяшні дзень і будучае краіны. І тут рашаючым з'яўляецца не толькі педагагічнае майстэрства, але наша сумленне, пачуццё адказнасці і ўласнай годнасці.

Трэба выкарыстоўваць дэмакратыю, галоснасць, шырокія выбарныя пачаткі для таго, каб у вышэйшай школе працавалі кваліфікаваныя, добрасумленныя, прыстойныя людзі, якія адпавядаюць яе высокаму прызначэнню.

Паважаныя таварышы, рашэнні партыі і ўрада вызначылі праграму развіцця вышэйшай адукацыі. Поспех справы ў руках кожнага з нас. Любыя пытанні рашаюцца, калі іх вырашаць, а не чакаць, калі гэта зробіць для нас нехта іншы.

Трэба вызначыць свае шляхі і магчымасці ў перабудове вышэйшай школы, унесці пасільны ўклад у агульную справу, дамагчыся поспеху, які абавязкова выкліча за сабой новы поспех.

Віншую вас з новым вучэбным годам, жадаю здароўя і радасці ў працы, шчасця, якое дораць высокая мэта і адданасць справе.

## ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

# Трымай білет у ведаў свет




СЁННЯ бацькі могуць уздыхнуць свабодна. Не выпадкова таму ў гэты дзень іх сабралася тут нямала. Прыйшлі да нас, ва універсітэцкі дворык, родныя, маленькія браты, сястрычкі, сябры. Яны сціпла туляцца ўбаку, а ў вачах — ціхая радасць і гонар. Ну, як жа, вунь мой Андрушка ці Волечка... Калі яны ўжо паспелі стаць дарослымі?..

— Каб займаўся добра, быў прыкладным і ў працы, і ў вучобе, і ў дысцыпліне,— жадае свайму сыну Уладзімір Кірылавіч Марчук з Камянецка Брэсцкай вобласці ў міні-інтэрв'ю для «Беларускага універсітэта».

Ігар Хівук не дазволіў маці быць побач на ўступных экзаменах. Толькі калі здаў адзіную для яго, медаліста, фізіку на выдатна (як і Ігар Марчук), патэлефанаваў дадому. Ігарава мара здзейснілася: ён будзе вучыцца на факультэце радыёфізікі і электронікі. Праз газету яго маці, Любоў Якаўлеўна, перадае сыну, каб ён і далей развіваў свае веды з ранейшай упартасцю і працавітасцю, не падводзіў школьных настаўнікаў з вёскі Знаменка Брэсцкага раёна.

Яны розныя, нашы навабранцы. Гэта добра. Галоўнае, каб былі яны падобныя ў адной рысе, ад якой і ў іх асабістым лёсе, і ў лёсе краіны залежыць многае: у сур'ёзных адносінах да вучобы. Хочацца вельмі спадзявацца, што гэта рыса і аб'ядноўвае іх усіх. Інакш як зразумець сёлетні высокі конкурс, у якім удзельнічалі лепшыя з лепшых? Таму заслугоўваюць, на мой погляд, нашы першакурснікі, і па праву, добрага звання «пераможца».

Гучыць радыёгазета. Прэзідыум займае месцы. Сярод членаў прэзідыума — партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія работнікі, выкладчыкі, ганаровыя госці.

Рэктар Леанід Іванавіч Кісялеўскі абвяшчае адкрыццё ўрачыстай цырымоніі, прысвечанай Дню ведаў.

Гучаць Дзяржаўныя гімны краіны і рэспублікі.

— Смірна! Раўненне на сцягі! Сцягі ўнесці!

...Словы ішлі шчыра, ад сэрца. Л. І. Кісялеўскі ў сваёй прамове гаварыў пра экзамен, што трымае вялікі корпус выкладчыкаў і прафесараў перад партыяй і ўрадам. «Павышэнне якасці выкладання не толькі загад часу, гэта перш за ўсё — павышэнне якасці спецыялістаў. Шмат будзе залежаць не толькі ад нашай працы, але і ад вашай. У школе вы былі лепшымі, тут пачняце радавымі. Цяпер сярод вас няма выдатнікаў, усе роўныя. Таму ўсё наступнае будзе залежаць толькі ад вас. Не знойдзеце вы тут апекі, да якой прывыклі ў школе. Сустрэнецеся з патрабаваннямі, аднак пасільнымі для вас. Спадзяемся, што новы экзамен, экзамен на самастойнасць, вытрымаеце з поспехам!»

Сакратар парткома Мікалай Іосіфавіч Юрчук павіншаваў першакурснікаў з Днём ведаў. «Вы — будучае нашай краіны. Для таго, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, шмат спатрэбіцца на працягу пяці гадоў працы, энергіі. Ці гатовы вы да гэтага? Пяцігадовы універсітэцкі марафон не кожны зможа адолець з поспехам. Сумная статыстыка сведчыць: кожны дзесяты першакурснік так і не атрымлівае дыплома. Ад таго, як пачняце вы вучобу іменна на першым курсе, залежыць, сярод каго вы акажацеся: сярод дзевяці ці дзесятым... Сучасны спецыяліст, памятайце, мае не толькі высокі ўзровень прафесійны, а і ідэйны. Уключайцеся з першых дзён у грамадскую работу!»

— У нас ва універсітэце,— гаворыць сакратар камітэта камсамола Аляксандр Жук,— ёсць добрая традыцыя,— ускладаць у знамянальныя дні кветкі да помніка У. І. Леніну і мемарыяльнага Знака студэнтам і выкладчыкам, якія аддалі сваё жыццё ў гады вайны.

Наступае мінута памяці.



Потым да мікрафона падыходзіць дэкан факультэта журналістыкі Алег Георгіевіч Слука. Ён пажадаў новым членам вялікай універсітэцкай сям'і, «каб клопат нашага народа стаў і вашым клопатам... Няхай і далей квітнее Балдзяржуніверсітэт!»

— Першы — сёмы, першы — соты, першы — двухтысячны, той, на якім абарваўся спіс паступіўшых сёлета ў БДУ,— так пачаў сваю гутарку са студэнцтвам прафесар Алег Антонавіч Лойка.— Магчыма, вы не ўсведамляеце таго, што ў вас ёсць, чым валодаеце... А ёсць у вас нямала. Выдатнік, да слова, падаражаў у два разы, дзяржава павялічыла сродкі на вашу адукацыю... Вы не толькі «дзяржаўныя», памятайце, вы яшчэ матуліны і татулевы... Не забывайцеся пра іх. Няхай яны ніколі не саромеюцца за вас. Але я хачу сказаць не пра адмоўныя эмоцыі, а пра тыя, што дапамагаюць жыць. Аб жаданні. Пажадалі — паступілі. Жадаць — магчы. Верым — будзеце выдатнікамі. У добры час!

Значным момантам свята з'явілася запальванне лепшымі студэнтамі універсітэта Агню ведаў. У гэтым полымі свяшчэнная памяць пра тых, хто ствараў, будаваў родны універсітэт у грозныя дваццатыя, пра тых, хто з вучэбных аўдыторый ішоў на бітву з ворагам, пра тых, хто не шкадаваў сіл, здароўя, працаваў у навуковых лабараторыях у пасляваенныя гады.

Няхай гэты агонь будзе табе, першакурснік, пуцяводнай зоркай у бязмежным свеце ведаў!

Агонь ведаў — гэта добры агонь, калі веды нясуць людзям толькі шчасце. Таму сімвалічна, што Дзень ведаў і Дзень міру адзначаюцца разам.

Свята дасягае свайго кульмінацыйнага моманту: наступае доўгачаканая мінута пасвячэння ўчарашніх абітурыентаў у студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Леанід Іванавіч Кісялеўскі ўручае сімвалічны ключ у Краіну ведаў і вялізных памераў студэнцкі білет. Студэнцкія атрыбуты прымаюць першакурснікі: дэлегат XX з'езда камсамола Алена Вячорка і кавалер ордэна Чырвонай Зоркі Сяргей Макаранка. Алена заверыла ад імя першакурснікаў, што з самага пачатку яны ўвальюцца ў дружную універсітэцкую сям'ю.



Сур'ёзнеюць твары прысутных, гучыць тэкст урачыстай клятвы студэнтаў-першакурснікаў:

—...Мы, прадстаўнікі шматмільённай арміі моладзі, уступаючы ў рады студэнцтва, урачыста клянёмся: свята выконваць запаветы Леніна, упарта і настойліва вучыцца,... усё жыццё несці палаючы факел ведаў.

І ў адказнае, трохразовае «КЛЯНЁМСЯ!» верыш, хочацца верыць, што новае папаўненне будзе «высока несці, захоўваць і памнажаць слаўныя традыцыі нашы, будзе дастойным пачэснага звання Студэнта і Выпускніка універсітэта, які носіць імя вялікага правадыра рэвалюцыі!» Дадзенаму слову верым.

Агонь ведаў-1987 перадаецца першакурснікам. Моцна трымай яго, таварыш! Хай ніколі ён не патухне ў тваім жыцці. Не падвядзі!

А потым адбыўся святочны канцэрт мастацкай самадзейнасці творчых калектываў універсітэта.

АД АЎТАРА.

— Што гэта тут, танцы будуць? — спыталася ў мяне нейкая бабулька.

Ці тая бабулька — жартаўніца ці наіўная крышачку, але... Пачатак свята зацягваўся. Рыпучы рэпрадуктар нешта мармытаў сабе пад нос. (Дарэчы, калі ўжо ва універсітэце будзе больш-менш добрая радыёапаратура?). Ну, а потым, як вы ўжо ведаеце, адбылося свята. Слова «свята» у мяне сустракаецца шмат разоў, а вось пра святочны настрой — мне неяк і думка не прыйшла заўважыць. Можна зараз?

Мне здаецца, адпавядаючы падзеі настрой не заўсёды прыходзіць сам сабой, калі яго пасіўна чакаюць і спадзяюцца, мала што для гэтага робячы. А ці не самае галоўнае — стварыць святочную атмасферу? Напэўна, гэта ведаюць і без мяне тыя, каму была даручана падрыхтоўка Дня ведаў.

Правядзенне Дня, было ўражанне, адбывалася па хутка складзенаму (на жывую нітку), але старому сцэнарыю... Памятаю 31 жніўня мінулага года. Асноўныя моманты — тыя ж. Напэўна, без іх нельга абысціся, яны як каркас, але былі і дадатковыя моманты, выразныя «дробязі», накшталт чарады галубоў, адпушчаных увышыню. А сёння... Не, відавочна, нечага не хапала, не тое выдумкі, не тое больш дакладнай арганізаванасці. А можа састарыўся трохі сцэнарый? Ды і навошта з году ў год прытрымлівацца аднаго і таго ж? Першакурснікам ўсё роўна ўсё ўпершыню? Але на свята прыходзяць не толькі «навічкі», а і студэнты старэйшых курсаў. Напрыклад, Сяргей Грынцэвіч, трэцякурснік факультэта радыёфізікі і электронікі, Аляксандр Рацькоў, чацвёртакурснік таго ж факультэта, камандзір атрада імя П. Купрыянава. Два сябры сёлета працавалі ў Калевальскім раёне Карэльскай АССР. Зразумела, засумавалі па родных сценах, прыйшлі пабачыць знаёмых, паглядзець на падаючых надзею, заўважыць змены і даведацца аб навінах. Пастаялі трохі. І пайшлі. Сумна.

А ў чым нельга папракнуць арганізатараў, дык, у першую чаргу, у тым, што цырымонія не зацягнулася на доўгія гадзіны...

Навошта я напісала сваё асабістае меркаванне, а не пакінула яго для сябе? Да таго ж і рэпартаж — святочны. А на свяце традыцыйна лічыцца: заўсёды ўсё добра. Напэўна, для таго, каб, прыйшоўшы ва універсітэт 31 жніўня 1988 года, усклікнуць пасля: «Вось малайцы! Вось гэта свята!»

Рэпартаж правялі
А. ВІХРОВА
і В. ЧАРНЯЎСКІ (фота).

# ДА ВЫНІКАЎ ПРЫЁМУ

**Універсітэцкія калідоры адгулі пасля прыступу настойлівых і не зусім упэўненых у сабе абітурыентаў. Болей як 6 тысяч рабочых, калгаснікаў, служачых, выпускнікоў сярэдніх школ і ПТВ трымалі экзамен на права стаць студэнтамі славутай ВНУ рэспублікі. Амаль палова з іх сёння можа радавацца свайму залічэнню ў сям'ю дапытлівага студэнцтва.**

## НА ПРЫСТУПЦЫ «АБІТУРЫЕНТ—СТУДЭНТ»

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ 1987 года значна адрозніваліся ад правілаў папярэдняга года. Гэта прынесла нямала клопатаў як абітурыентам і іх бацькам, так і сакратарыяту прыёмнай камісіі.

Можна вылучыць асноўныя асаблівасці правілаў прыёму 1987 года:

— былі павышаны патрабаванні да прафесійнай арыентацыі моладзі. На такія спецыяльнасці, як журналістыка, правазнаўства, а таксама па спецыяльнасцях, дзе вядзецца падрыхтоўка выкладчыкаў для сярэдніх школ, правіламі былі абумоўлены дадатковыя патрабаванні да паступаючых;

— прыём па накіраваннях міністэрстваў і ведамстваў, органаў народнай адукацыі вызначаўся шырокамаштабнасцю;

— былі больш дакладна і адназначна сфармуляваны льготы, якія прадастаўляюцца абітурыентам, а таксама парадак залічэння.

У асноўным новаўвядзенні адлюстроўвалі дух апошніх рашэнняў партыі і ўрада аб перабудове вышэйшай і сярэдняй агульнаадукацыйнай школ і адыгралі станоўчую ролю.

Мяркуючы па колькасці пададзеных заяў і якасці атэстатаў, цікавасць да вышэйшай і асабліва да універсітэцкай адукацыі значна ўзрасла. Можна сказаць, што найбольш падрыхтаваныя выпускнікі сярэдніх школ і тэхнікумаў сканцэнтраваліся сёлета ў БДУ, адсюль — высокі конкурс на ўсе факультэты. Больш за 1400 абітурыентаў мелі дыплом з адзнакай ці былі ўзнагароджаны медалямі. Парадавала, што няшмат аказалася абітурыентаў, у якіх меліся адна-дзве «тройкі».

На шэрагу факультэтаў агульны конкурс атрымаўся такім высокім, што на адно месца прыходзілася па некалькі медалістаў. Гутарка ідзе пра такія факультэты, як гістарычны, хімічны, механіка-матэматычны, юрыдычны. Самы высокі прахадны бал належаў юрфаку і хімфаку; пераадолець бар'ер вышынёй у 14 балаў неабходна было, каб стаць студэнтам гістарычнага, фізічнага, біялагічнага факультэтаў, аддзялення рускай мовы і літаратуры філфака; 12 балаў трэба было набраць, каб паступіць на спецыяльнасці «прыкладная матэматыка», «радыёфізіка і электроніка», «беларуская мова і літаратура». Найбольш нізкі прахадны бал склаўся на педагагічным аддзяленні геаграфічнага і фізічнага факультэтаў.

У цэлым па універсітэту па ўсіх відах ільгот і накіраваннях (у тым ліку асоб, якія маюць стаж 2 гады працы, інвалідаў, сірот і інш.) залічана з балам ніжэй за прахадны для школьнікаў 300 чалавек з 1975 прынятых (15,1 працэнта). Аднак размеркаванне па факультэтах істотна рознае: па юрыдычнаму факультэту 131 чалавек (58,2 працэнта) карысталіся льготамі, а на ўсе астатнія — 169 чалавек (9,2 працэнта).

Трэба заўважыць, што пазаконкурснае залічэнне, а ў шэрагу выпадкаў і мэтавае, не спрыяюць паляпшэнню кантынгенту студэнтаў. Некаторыя ведамствы выдаюць накіраванні не самым лепшым кандыдатам у абітурыенты (маўляў, медаліст — і сам паступіць), мяркуючы, што выдача накіравання раўнасільная залічэнню. Уладальнік накіравання нярэдка арыентуецца, каб здаць уступныя экзамены на «троечкі». З такой арыентацыяй многіх спасцігла расчараванне. Асобныя райана і ведамствы павярхоўна адНесліся да мэтавага прыёму, накіраваўшы толькі па аднаму абітурыенту на адно мэтавае месца, пры гэтым — недастаткова падрыхтаваных, што прывяло да значнага невыканання плана мэтавага набору. Сярод іх: Мінхлеб БССР (на 6 месц — 2 чалавекі), Мінлегпрам БССР (14 месц — 4 чалавекі), БЕЛВА «Экран» г. Барысава (8 месц — заяў не паступіла). На неаднаразовыя напаміны з боку прыёмнай камісіі гэтыя арганізацыі належным чынам не адрэагавалі.

І яшчэ. Пры арганізацыі мэтавага прыёму наша камісія сутыкнулася з фактамі адмовы абітурыентаў ад выдадзеных ім накіраванняў: не задавальняе іх перспектыва вярнуцца ў свае раены. Думаецца, іменна па гэтай прычыне значная частка мэтавых месц, засталася непацверджанай заявамі ад канкрэтных асоб.

Найбольш паспяховую працу па падбору кандыдатаў для мэтавага навучання правялі выканкомы аблсаветаў народных дэпутатаў (спецыяльнасць — «правазнаўства»), Міністэрства юстыцыі БССР, Пракуратура БССР, ад якіх на адно месца накіроўвалася два і болей чалавек.

Прыкладам цеснага супрацоўніцтва прыёмнай камісіі і факультэта радыёфізікі і электронікі можа служыць арганізацыя і падбор абітурыентаў на ВА «Інтэграл», дзе большасць з тых, што мелі мэтавыя накіраванні (143 чалавекі) сярэднюю школу скончылі з медалём.

Трэба заўважыць, што пазаконкурсны і мэтавы прыём у шэрагу выпадкаў дэфармавалі конкурс. На хімічным факультэце па агульнаму конкурсу былі залічаны толькі медалісты і па двух экзаменах тыя, хто набраў 10 балаў; у той час, як па мэтаваму прыёму былі залічаны асобы, якія мелі тройкі. Добра, што такіх няшмат.

— «Два» — гэта калі нічога не ведаеш. А я нешта гаварыў. Прызнаю, што ведаю дрэнна, але мне патрэбна толькі «троечка»,— так апраўдвалі яны свой правал, заклікаючы да жалю, не задумваючыся, а як жа вучыцца ў ВНУ, маючы вельмі цьмяныя ўяўленні па асноўнаму прадмету абранай спецыяльнасці?

Ільготныя ўмовы, відавочна, павінны быць у любой галіне чалавечай дзейнасці. Яны павышаюць сацыяльную справядлівасць, падкрэсліваюць гуманізм грамадства. Гэта датычыцца і ўмоў паступлення ў ВНУ. І, зразумела, першымі, каму патрэбна асаблівая ўвага грамадства,— інваліды і сіроты. Але вось на збянтэжваючае пытанне няўдачлівых абітурыентаў і іх бацькоў: «Як да наступнага года атрымаць ільготу?» — не ведаеш, як і адказаць. Тыя, хто яго задае, не разумеюць, што пытанне іх — амаральнае.

На жаль, ёсць у нашых дакументах і іншыя лічбы. 8,5 працэнта (168 чалавек) залічаных мелі нізкі прахадны бал (10 і 9). Амаль 70 працэнтаў з іх будуць вучыцца на трох факультэтах: геаграфічным, юрыдычным, філалагічным. Каб утрымацца ў студэнцкім калектыве, гэтым таварышам прыйдзецца шмат папрацаваць. Перад выкладчыкамі ставіцца задача: з першых дзён заняткаў высветліць прагалы ў ведах кожнага першакурсніка і дапамагчы ў ліквідацыі недахопаў. Але асноўны цяжар гэтай працы — усё ж за самімі першакурснікамі. І тут галоўнае — не хаваць ад таварышаў, самі сябе і выкладчыкаў сваё невуцтва, а змагацца з ім разам.

Час уступных экзаменаў — цяжкі, хвалюючы. Гэта не толькі час перамог, радасці, самасцвярджэння, ажыццяўлення мары, але і, можа, паласа няўдач, момант пераацэнкі ведаў, праверка, калі жадаеце, на мужнасць, сталасць.

Рэктарат, сакратарыят прыёмнай камісіі, выкладчыкі, якія прымалі экзамены, разумелі, што яны — удзельнікі важнейшай дзяржаўнай акцыі вялікага палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага значэння. З гэтага разумення вынікалі ўвага да абітурыента, цярплівае растлумачэнне ўсіх палажэнняў бацькам і родным паступаючых, жорсткае прытрымліванне інструктыўных палажэнняў, нарматыўнае патрабаванне да ацэнкі ведаў, стварэнне абставін даверу і добразычлівасці.

Цяпер жа у нашых былых абітурыентаў — час авалодання ведамі. Хочацца пажадаць усім першакурснікам смеласці, настойлівасці ў цікавым, цяжкім працэсе спасціжэння здабытых чалавецтвам ісцін. А тым, хто не паступіў — не пакідаць сваёй мары і рыхтавацца да новай абітурыенцкай пары.

**Э. ШПІЛЕЎСКІ,**
адказны сакратар
прыёмнай камісіі.



# ТВОЙ СЯБАР — БІБЛІЯТЭКА

**Без самастойнай працы няма сапраўднага студэнта. Хто можа запярэчыць, што гэта не так? Зразумела, ніхто. А хто супраць таго, што лепшае месца для самастойнай работы — бібліятэка? А вось з тым, што тут самому заўсёды можна знайсці неабходную літаратуру, згодзяцца нямногія. Асабліва складана арыентавацца ў мностве стэлажоў і паліц першакурснікам. І сёння, каб хоць крыху дапамагчы ім, мы зробім своеасаблівае падарожжа па бібліятэцы: пазнаёмімся з яе гісторыяй і сённяшнім днём.**

## «АДКРЫТЫ СТОЛ ІДЭЙ»

ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ бібліятэка БДУ імя У. І. Леніна — адна з буйнейшых у рэспубліцы — пачала сваю работу ў 1921 годзе адначасова з заснаваннем універсітэта. Аснову яе фонду склалі 40 тысяч кніг, перададзеных Камісіяй Народнай асветы БССР. Яна была адчынена для агульнага карыстання і фактычна з'яўлялася дзяржаўным кнігасховішчам рэспублікі. У 1926 годзе універсітэцкая бібліятэка была рэарганізавана ў Беларускую дзяржаўную (зараз Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна), якая адначасова з'яўлялася фундаментальнай бібліятэкай універсітэта. А праз некаторы час з саставу Дзяржаўнай была выдзелена бібліятэка універсітэта. К 1941 году фонд яе склаў звыш 200 тысяч тамоў.

У перыяд часовай акупацыі Мінска гітлераўскімі захопнікамі большая частка кніг была знішчана, а найбольш каштоўная літаратура вывезена ў Германію. Аднаўленне бібліятэкі пачалося ў 1943 годзе, калі універсітэт пачаў сваю работу на станцыі Сходня пад Масквой. Толькі к 1952 году фонд бібліятэкі дасягнуў даваеннага ўзроўню.

Зараз бібліятэка налічвае звыш 1,9 млн. экземпляраў. На працягу года яна абслугоўвае больш за 21 000 чытачоў. Гэта — выкладчыкі, навуковыя супрацоўнікі, аспіранты, студэнты універсітэта. Багаты і разнастайны фонд бібліятэкі. Вялікае месца займаюць творы класікаў марксізму-ленінізму, матэрыялы і дакументы КПСС і КПБ, а таксама грамадска-палітычная літаратура. Значную частку фонду складае прыродазнаўчанавуковая і матэматычная літаратура. Шырока прадстаўлена літаратура па гуманітарных навуках і мастацкая. У аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі можна пазнаёміцца з дарэвалюцыйнымі выданнямі (кнігамі і часопісамі), галоўным чынам XVIII—XIX стагоддзяў.

Абслугоўванне чытачоў ажыццяўляюць два абанементы і шэсць чытальных залаў бібліятэкі, аддзелы філалагічнай, юрыдычнай, біялагічнай і радыёфізічнай літаратуры, бібліятэка падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян, чытальная зала ў інтэрнаце № 7 і 47 бібліятэк кабінетаў і кафедраў.

Фонд бібліятэкі амаль цалкам задавальняе патрэбы студэнтаў у літаратуры, якая неабходна на працягу вучэбнага года. Аддзелам вучэбнай літаратуры выкарыстоўваецца метад групавога абслугоўвання, дзякуючы якому студэнты I—IV курсаў на працягу першага тыдня новага вучэбнага года атрымліваюць дапаможнікі на цэлы семестр.

У аддзеле навуковай і мастацкай літаратуры можна атрымаць навуковыя манаграфіі, мастацкую літаратуру, выданні на замежных мовах.

У бібліятэцы працуюць 9 чытальных залаў на 600 месц, дапаможныя фонды якіх укамлпектаваны вучэбнай літаратурай, вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі па профілю залы, энцыклапедыямі, слоўнікамі, даведнікамі. Акрамя кніг сюды паступаюць перыядычныя выданні, а таксама найбольш каштоўная літаратура з агульнага кнігасховішча. Да фондаў чытальных залаў арганізаваны адкрыты доступ.

Выданні, якія адсутнічаюць у бібліятэцы універсітэта, можна атрымаць з бібліятэк Мінска або заказаць з любой бібліятэкі Савецкага Саюза па міжбібліятэчнаму абанементу. Такая служба працуе пры даведачна-бібліяграфічным аддзеле.

Каб знайсці патрэбную кнігу, падабраць матэрыял для даклада, рэферата, палітінфармацыі або курсавой работы, неабходна звярнуцца ў залу даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Тут размяшчаецца асноўны даведачна-пошукавы апарат бібліятэкі: алфавітны і сістэматычны каталогі, картатэкі, энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі, бібліяграфічныя і інфармацыйныя выданні. Дзяжурны бібліёграф дапаможа падабраць літаратуру па тэме, удакладніць шыфр кнігі, знайсці неабходныя звесткі аб якой-небудзь падзеі, дасць кансультацыю па пытаннях самастойнага пошуку літаратуры, складанню спісаў да курсавых і дыпломных работ і г. д.

У зале даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання працуе выстаўка новых паступленняў, дзе можна пазнаёміцца з літаратурай, якую атрымала бібліятэка за апошні тыдзень. Тут экспануюцца кнігі, часопісы, інфармацыйныя выданні.

Бібліятэка універсітэта займаецца рознабаковай масавай работай: праводзіць канферэнцыі чытачоў, літаратурныя вечары, дыспуты, сустрэчы з пісьменнікамі. Вялікая ўвага надаецца арганізацыі выставак літаратуры.

Да пачатку вучэбнага года арганізуецца цыкл выставак: «У дапамогу першакурсніку», «Знаёмцеся: універсітэт», «У дапамогу самастойнай рабоце студэнтаў», «Вучыцца патрэбна ўмець» і шэраг іншых.

Паважаныя першакурснікі! Коратка расказаўшы пра нашу бібліятэку, развітваючыся да сустрэчы ў ёй, супрацоўнікі жадаюць вам бясконцай прагі ведаў і максімальнага выкарыстання магчымасцей, якія дае наша бібліятэка.

А. І. Герцэн пісаў: «...Бібліятэка — гэта адкрыты стол ідэй, за які запрошаны кожны, за якім кожны знойдзе пажыву, якую шукае; гэта запасны магазін, куды адны паклалі свае думкі і адкрыцці, а другія бяруць іх у рост».

**Т. МІЦЮХІНА,**
загадчыца даведачна-бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі.

## ЗАЛЕЖЫЦЬ АД САМІХ

**Нездарма, жартуючы, кажуць, што ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела. І ўжо зусім сур'ёзна, уздыхаючы: «Сесія — самая напружаная пара». І сапраўды, тут ужо не да жартаў, бо вырашаецца пытанне: будзе час ад сесіі да сесіі вясёлым ці не зусім. Гэта ў пэўнай ступені залежыць ад таго, атрымлівае студэнт стыпендыю ці не. Але нават калі і атрымлівае, то заўсёды скардзіцца, што сорак рублёў на месяц не хапае. І калі няма дапамогі з дому, а стыпендыя — адзіная крыніца для існавання, то даводзіцца падрабляць, разгружаючы ўночы вагоны ці вартуючы (у лепшым выпадку). Зразумела, што гэта забірае шмат часу, якога студэнту заўсёды не хапае, адбіваецца на якасці ведаў і, нарэшце, на выніках сесіі. І вось у мэтах стымулявання вучэбнай работы, павышэння творчай актыўнасці аспірантаў і студэнтаў Цэнтральны Камітэт КПСС, Савет Міністраў СССР і ЦК ВЛКСМ прынялі Пастанову «Аб мерах па паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў аспірантаў, студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў». Каб пазнаёміць студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна з данай пастановай, наш карэспандэнт папрасіла адказаць на некаторыя пытанні галоўнага бухгалтара універсітэта В. П. САЛАДУХА.**

# СТЫПЕНДЫЯ

— Валянціна Пятроўна, раскажыце, калі ласка, аб памерах стыпендыі.

— Перш за ўсё адзначу, што яна не аднолькавая на ўсіх факультэтах. Для студэнтаў I—IV курсаў стыпендыя складае 40, пятага — 45 рублёў у месяц. Для тых, хто займаецца на факультэтах, якія рыхтуюць настаўнікаў школ, стыпендыя ўстанаўліваецца на 10 рублёў больш, хто вучыцца па спецыяльнасці «філасофія», «палітычная эканомія», «навуковы камунізм», «гісторыя КПСС» — на 15 рублёў. Студэнтам, якія набываюць спецыяльнасць «прыкладная матэматыка», «матэматыка», «механіка», будзе выплачвацца на I—III курсах 70, а на IV—V — 75 рублёў у месяц. У мэтах стымулявання вучобы, павышэння творчай актыўнасці студэнтам, якія па выніках экзаменацыйнай сесіі маюць толькі выдатныя адзнакі, стыпендыя павышаецца на 50 працэнтаў, а калі адзнакі выдатныя і добрыя — на 25 працэнтаў. Для нагляднасці прывяду прыклад. Вы вучыцеся па спецыяльнасці «філасофія» і здалі сесію на выдатна. Значыць, стыпендыя ў вас будзе: 40 руб.+15 руб.+20 руб. (надбаўка 50 працэнтаў за «выдатна») — усяго 75 рублёў.

**— Паклапацілася дзяржава таксама пра дзяцей-сірот і пра студэнтаў, якія адпаведна з рашэннямі ўрада СССР знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні...**

— Так, і гэта асабліва важна адзначыць. Студэнтам з ліку дзяцей-сірот, якія засталіся без апекі бацькоў, устанаўліваецца спецыяльная стыпендыя памерам 80 рублёў у месяц. Для гэтага патрэбна падаць неабходныя дакументы, пералік якіх прыведзены ў «Інструкцыі аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам вышэйшых навучальных устаноў». Для тых, хто знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, стыпендыя складае 20 рублёў. Тут патрэбна адзначыць адно «але». Студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, залічаных на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне, назначаецца стыпендыя 40 рублёў.

Спецыяльная стыпендыя (100 рублёў у месяц) устаноўлена студэнтам — Героям Савецкага Саюза і Героям Сацыялістычнай Працы.

Усе названыя катэгорыі могуць атрымліваць павышаную стыпендыю: на 50 працэнтаў пры здачы сесіі на выдатна і на 25 — пры атрыманні выдатных і добрых адзнак.

**— А у якіх памерах устаноўлены імянныя стыпендыі?**

— Стыпендыі імя У. І. Леніна і імя К. Маркса складаюць 130 рублёў, імя выдатных партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, дзеячаў навукі, тэхнікі і культуры, устаноўленыя рашэннямі ўрада СССР,— 110, а рашэннямі Саветаў Міністраў саюзных рэспублік — 100 рублёў у месяц. За кошт сродкаў ВЛКСМ будзе выплачвацца стыпендыя імя Ленінскага камсамола — 100 рублёў.

**— Вышэйназванай пастановай зацверджаны новы від стыпендыі — стыпендыя вучонага савета.**

— Яна будзе выплачвацца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў за поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці. Памер яе — да 90 рублёў у месяц. Але ўказаная стыпендыя ўстанаўліваецца для МДУ ў колькасці дзесяці, для вядучых ВНУ — сямі, для ўсіх астатніх — не больш трох стыпендый.

**— Валянціна Пятроўна, коратка пазнаёмце нашых чытачоў, асабліва першакурснікаў, з парадкам назначэння стыпендый.**

— Назначэнне стыпендыі праходзіць два разы ў год па выніках экзаменацыйных сесій з першага чысла наступнага за сесіяй месяца. Зразумела, у першую чаргу права на атрыманне стыпендыі маюць тыя студэнты, якія здалі экзаменацыйную сесію на выдатна і добра і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці калектыву. Студэнтам, якія маюць здавальняючыя адзнакі, стыпендыя назначаецца па прадстаўленню калектываў студэнцкіх груп і грамадскіх арганізацый. Некаторыя лічаць, што студэнт, які мае адну тройку, карыстаецца перавагай перад тымі, у каго іх больш. Гэта не так. Тут ва ўсіх правы аднолькавыя. Ім назначаецца стыпендыя ў апошнюю чаргу, гэта значыць, пасля поўнага стыпендыяльнага забеспячэння студэнтаў, якія не маюць па выніках сесіі здавальняючых адзнак.

**— З гэтага правіла зроблена выключэнне для асобных катэгорый студэнтаў...**

— Яно распаўсюджваецца на студэнтаў — Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай Працы; накіраваных у ВНУ у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў СССР «Аб удзеле прамысловых прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў у камплектаванні ВНУ і тэхнікумаў і ў падрыхтоўцы спецыялістаў для сваіх прадпрыемстваў» і іншымі рашэннямі ўрада СССР; студэнтаў з ліку дзяцей-сірот, якія засталіся без апекі бацькоў; дзяцей інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны і інвалідаў працы I і II груп і інш.

**— З Вашага адказу зразумела, што асноўны крытэрый пры назначэнні стыпендыі — вынікі экзаменацыйнай сесіі. Але ў першакурснікаў іх няма.**

— Ім у першым семестры стыпендыя назначаецца з улікам адзнак, атрыманых на ўступных экзаменах, у звычайным памеры (без пяцідзесяці- і дваццаціпяціпрацэнтных надбавак за атрыманне выдатных і добрых адзнак на уступных экзаменах). Сярэдні бал атэстата не ўлічваецца. У другім і наступных семестрах стыпендыі першакурснікам назначаюцца на агульных умовах.

**—— Уявім такую сітуацыю: студэнт не згодзен з рашэннем камісіі аб адмаўленні ў стыпендыі. Куды ён можа звярнуцца ў такім выпадку?**

— Ён мае права абскардзіць яго рэктару ВНУ, які сумесна з прадстаўнікамі дэканата, вучэбнай групы, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый выносіць канчатковае рашэнне.

**— І яшчэ адно пытанне, хаця яно не датычыць непасрэдна студэнтаў: якія стыпендыі ўстаноўлены для аспірантаў?**

— Тут таксама ёсць змены. Выпускнікам ВНУ і асобам, якія паступілі ў аспірантуру з практычнай работы са стажам да трох гадоў, у першы год вучобы выплачваецца стыпендыя 110, у другі і трэці — 120 рублёў у месяц. Калі сённяшні аспірант мае стаж больш за тры гады, то першы год ён будзе атрымліваць 130, а другі і трэці 140 і 150 рублёў у месяц адпаведна. Агаворана стыпендыя і тым, хто да паступлення ў аспірантуру меў сярэдні заробак 150 рублёў і больш. Тады памер стыпендыі — 150 рублёў ва ўсе гады навучання.

**— Валянціна Пятроўна, магчыма, у Вас ёсць заўвагі ці дапаўненні па тэме нашай гутаркі?**

— Заўваг няма. Хочацца толькі дадаць вось што. Прызначэнне стыпендыі — стымуляваць вучобу студэнтаў і актыўны ўдзел іх у навукова-даследчай і грамадскай рабоце. Дзяржава за кожным студэнтам замацавала права на атрыманне стыпендыі. Рэалізацыя гэтага права залежыць выключна ад самога студэнта.

Запісала
З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

## ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК

# Правы і абавязкі

**СТУДЭНТЫ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ МАЮЦЬ ПРАВА:**

— карыстацца бясплатна лабараторыямі, кабінетамі, аўдыторыямі, чытальнымі заламі, бібліятэкамі, падлікова-вылічальнымі і вучэбна-дапаможнымі ўстановамі, а таксама спартыўнымі базамі, збудаваннямі, спартыўным інвентаром і іншым абсталяваннем вышэйшай навучальнай установы;

— удзельнічаць у навукова-даследчай рабоце, якая арганізуецца вышэйшай навучальнай установай і навуковым студэнцкім таварыствам;

— удзельнічаць праз грамадскія арганізацыі ў абмеркаванні пытанняў удасканалення вучэбнага працэсу, ідэйна-выхаваўчай работы, а таксама пытанняў паспяховасці, працоўнай і вучэбнай дысцыпліны студэнтаў, назначэння стыпендый, размеркавання месц у інтэрнатах — іншых пытанняў, звязаных з вучобай і бытам студэнтаў.

Студэнты ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці калектыву вышэйшай навучальнай установы, у рабоце спартыўных секцый, таварыскіх і навукова-тэхнічных гурткоў, у мастацкай самадзейнасці.

Студэнты пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы атрымліваюць работу па спецыяльнасці.

**СТУДЭНТЫ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ АБАВЯЗАНЫ:**

— сістэматычна і глыбока авалодваць тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі па выбранай спецыяльнасці;

— авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй і павышаць свой ідэйна-палітычны, навуковы і культурны ўзровень;

— набываць навыкі арганізацыі масава-палітычнай і выхаваўчай работы;

— наведваць абавязковыя вучэбныя заняткі і выконваць у вызначаныя тэрміны ўсе віды заданняў, прадугледжаныя вучэбным планам па праграмах;

— актыўна ўдзельнічаць у грамадска карыснай працы;

— захоўваць прынцыпы камуністычнай маралі;

— выконваць правілы ўнутранага распарадку вышэйшай навучальнай установы і студэнцкага супольнага жыцця.

Студэнту вышэйшай навучальнай установы, які здаў экзамены з адзнакай «выдатна» не менш чым па 75 працэнтах усіх дысцыплін вучэбнага плана, а па астатніх дысцыплінах — з адзнакай «добра» і абараніў дыпломны праект (работу) або здаў дзяржаўныя экзамены з адзнакай «выдатна», а таксама праявіў сябе ў навуковай і грамадскай рабоце, выдаецца дыплом з адзнакай.

Атрымаўшы дыплом з адзнакай карыстаецца перавагай пры размеркаванні на работу.



## ЗААХВОЧВАННІ

ЗА ДОБРУЮ паспяховасць, высокія паказчыкі ў вучэбнай рабоце і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта для студэнтаў устанаўліваюцца наступныя заахвочванні:

— аб'яўленне падзякі;

— узнагароджанне граматамі;

— узнагароджанне кашгоўным падарункам;

— выплата прэміі.

## ПЕРАВОД СТУДЭНТА З ВНУ Ў ВНУ

Перавод студэнтаў з адной навучальнай установы ў другую аднатыпную дапускаецца толькі да пачатку навучальнага года з дазволу рэктараў абедзвюх ВНУ.

## КЛАПОЦІЦЦА ПРАФСАЮЗ

# Каб быт спрыяў вучобе

ПЕРШАКУРСНІК! Уступіўшы ў студэнцкую сям'ю, ты будзеш жыць цікавым, насычаным жыццём. Акрамя асноўнага занятку — вучобы, студэнцкае жыццё мае шмат іншых бакоў. Немалаважнае месца адводзіцца быту. Універсітэт мае восем інтэрнатаў, дзе пражывае больш за 70 працэнтаў іншагародніх студэнтаў. Астатнім прафком па меры магчымасці дапамагае размясціцца на прыватных кватэрах. У жніўні-кастрычніку ў прафсаюзным камітэце (пакой 302 галоўнага корпуса) вы можаце ўзяць адрасы гэтых кватэр.

Быт у інтэрнатах арганізуецца студэнцкімі органамі самакіравання — студсаветамі з дапамогай студгарадка і падначаленага яму абслугоўваючага персаналу. Студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах, абавязаны дапамагаць студсаветам і адміністрацыі ў паляпшэнні жыллёва-бытавых умоў. Усе пытанні быту і адпачынку вырашаюцца студэнцкімі саветамі сумесна са старастамі пакояў і паверхаў.

Студэнты ўласнымі сіламі праводзяць «касметычны» рамонт жылых памяшканняў, афармляюць пакоі. Усё гэта садзейнічае захаванню студэнцкага жылога фонду, стварэнню аптымальных умоў працы, быту і адпачынку. Падтрыманне парадку і чысціні ў жылых пакоях, а таксама ў чытальных залах, ленінскіх пакоях, пакоях дружбы — абавязак не толькі абслугоўваючага персаналу, а ў першую чаргу саміх студэнтау.

У нашым універсітэце створаны таксама ўсе ўмовы для заняткаў спортам. Студэнты — актыўныя прадаўжальнікі спартыўных традыцый, закладзеных папярэднікамі, многія з якіх у свой час былі чэмпіёнамі і прызёрамі сусветных і еўрапейскіх першынстваў. Сярод іх можна назваць А. Купрэйчыка, Л. Кайгародаву, К. Маджыдава, Т. Савіцкую і многіх іншых.

Ва універсітэце праводзіцца спартакіяда па 24 відах спорту, у якой удзельнічаюць усе факультэты. Па адзінаццаці відах спорту спаборнічаюць вучэбныя групы. Жадаючыя могуць наведваць спартыўныя секцыі баскетбола, валейбола, футбола, цяжкай атлетыкі, вольнай і класічнай барацьбы, фехтавання, мастацкай гімнастыкі, шахмат і многія іншыя.

Шэсць спартыўных залаў, адкрытыя пляцоўкі — матэрыяльная база, якую мае універсітэт. Але, на жаль, гэтага недастаткова. Праз два гады ўвойдзе ў дзеянне спартыўны комплекс з плавальным басейнам і заламі для гульняў.

Для кожнага з вас вельмі важна з першых дзён знаходжання ва універсітэце прывучыць сябе да штодзённых заняткаў фізкультурай, выкарыстоўваючы для гэтага вольны ад вучобы час, а таксама выхадныя дні. Пешыя і лыжныя паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа не толькі ўмацоўваюць фізічна, але і абагачаюць духоўна, расшыраюць кругагляд. Штогод больш за дзве тысячы студэнтаў універсітэта ўдзельнічаюць у розных паходах і экскурсіях.

Прафсаюзная арганізацыя універсітэта пастаянна клапоціцца і аб паляпшэнні здароўя студэнтаў. Да іх паслуг — санаторый-прафілакторый на 100 месц. Тут кожны, хто жадае (перавагай карыстаюцца дыспансерныя хворыя), можа штогод адпачыць і паправіць сваё здароўе без адрыву ад вучобы. Працэдурныя кабінеты і кабінеты ўрачоў маюць сучаснае абсталяванне. Вас ветліва сустрэне і правядзе курс лячэння высокакваліфікаваны персанал. Прафсаюзны камітэт кожны год распаўсюджвае таксама больш за восемсот пуцёвак у здраўніцы СССР.

Акрамя гэтага ў час летніх канікулаў арганізуецца работа спартыўна-аздараўленчага лагера на возеры Нарач, дзе могуць адпачыць больш за 600 чалавек. Вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў карыстаецца і лагер працы і адпачынку на базе саўгаса-завода «Феадасійскі» у Крыму. Кожны год сюды прыязджаюць больш за трыста студэнтаў, каб дапамагчы саўгасу на ўборцы ўраджаю. Гэтым яны займаюцца ў першай палове дня, а ў другой для іх арганізуюцца экскурсіі па Крымскаму паўвостраву.

Вось толькі некаторыя бакі студэнцкага жыцця, зрабіць якое яшчэ больш цікавым і дынамічным можаш ты, першакурснік. Мы на цябе вельмі спадзяёмся.

А. КІШКЕВІЧ,
старшыня студэнцкага прафкома.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
10 верасня 1987 г.
Зак. 1588.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.